**Д. В. Гаўрыловіч**

# БЕЛАРУСКАМОЎНЫЯ ДЫМІНУТЫВЫ ЯК СРОДАК ПРАГМАТЫКОНУ Ў ДЫСКУРСЕ МЕСЕНДЖАРАЎ

Для сучасных інтэрнэт-зносін характэрны хуткі абмен інфармацыяй, які патрабуе спецыфічных форм. Адной з іх з’яўляюцца стыкеры, якія маюць шэраг адметных моўных сродкаў. Мэта даследавання – выявіць функцыянальна-прагматычны патэнцыял дымінутываў у кантэксце месенджараў. Матэрыял даследавання – беларускамоўныя дымінутывы ў месенджары «Viber».

Дымінутыў – гэта суб’ектыўна-ацэначная, памяншальна-ласкальная, лексічная адзінка мовы. Наяўнасць дымінутываў – маркер гутарковага маўлення. Памяншальныя формы слоў не толькі надаюць зносінам эмацыйную афарбоўку, але і служаць важным сродкам прагматыкону – сукупнасці фактараў, якія ўплываюць на змест і інтэрпрэтацыю паведамленняў. Дымінутывы, як правіла, выкарыстоўваюцца для стварэння больш цёплай і прыязнай атмасферы ў размове *(здароўкі, топчык, ты маё сонейка, падабайка, пакулькі)*.

Выкарыстанне дымінутываў дазваляе кампенсаваць недахоп непасрэдных зносін, ствараючы атмасферу даверу і блізкасці. Акрамя таго, яны могуць выконваць функцыю зніжэння напружанасці ў зносінах. У сітуацыях, калі абмяркоўваюцца далікатныя тэмы або ўзнікаюць канфлікты, памяншальныя формы дапамагаюць змякчыць катэгарычнасць меркаванняў і зрабіць іх менш агрэсіўнымі. Напрыклад, фразы *калі ласачка*, *дабраначкі* гучаць значна мякчэй, чым *калі ласка*, *дабранач*. Такім чынам, дымінутывы становяцца інструментам кіравання эмоцыямі як моўцы, так і слухача. Разам з тым, іх выкарыстанне не заўсёды апраўданае. У залежнасці ад кантэксту і адносін паміж камунікантамі, яны могуць успрымацца як недарэчныя ці нават прыніжальныя. Напрыклад, зварот да калегі па працы з выкарыстаннем памяншальнай формы можа выклікаць незадаволенасць і ўспрымацца як непавага. Таму важна ўлічваць прагматычныя аспекты зносін: сацыяльны статус суразмоўцы, кантэкст размовы і яго эмацыйную афарбоўку.

Такім чынам, дымінутывы ў дыскурсе месенджараў ўяўляюць сабой унікальны сродак стварэння эмацыйнай сувязі і кіравання атмасферай зносін паміж камунікантамі. Іх выкарыстанне дазваляе перадаваць не толькі інфармацыю, але і пачуцці, што асабліва важна ва ўмовах лічбавай камунікацыі.